# На сфагнавых сцежках гарадоччыны

**А ці ведалі вы, что у Гарадоцкім раёне можна знайсці ўнікальныя для нашай мясцовасці ягады, якія занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі, - марошку прысадзістую і журавіны драбнаплодныя? Калі не, запрашаю віртуальна прайсціся па экалагічнай сцяжыне «Таямніцы балот» рэспубліканскага заказніка «Карыценскі Мох».**

Заказнік займас плошчу ў 1400 га, а ў яго ландшафце дамінуе плоска-азёрная ледніковая нізіна з участкамі плоска-хваліста-водна-ледніковай раўніны. Гонарам і прыроднай жамчужынай яго з'яўляюцца два буйныя балоты верхавога тыпу - Карыценскі Мох і Чысцік-1.

На тэрыторыі асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыі (ААПТ) пераважаюць сасновыя, бяроза- выя, яловыя і чорнаальховыя лясы. Падчас прагулкі па балоцістых мясцінах можна сусграэць багун, верас, мірт, падвей і іншых прадстаўнікоў травяніста-хмызняковага яруса. Увогуле тут зарэгістравана 210 відаў сасудзістых раслін, у тым ліку чырвана-кніжныя - марошка прысадзістая і журавіны дроб-наплодныя. Дарэчы, журавінавыя палі займаюць паўночную частку балотнага масіва, а па перыферыі растуць чарнічнікі. Збор дзікарослых ягад і грыбоў на гэтай тэрыторыі - традыцыйны від дзейнасці для насельніцтва.

Тут можна азнаёміцца з жывёльным светам заказніка, які прадстаўлены такімі відамі, як лось, кабан, заяц-бяляк і русак, ліса, вавёрка. Ёсць на Гарадоччыне і чырванакніжныя мядзведзь, рысь і барсук. Дарэчы, папуляцыя касалапых апошнім часам значна вырасла (хутчэй за ўсё за кошт міграцыі з прыгранічных раёнаў Расійскай Федэрацыі, дзе на іх адкрыта паляванне).

На тэрыторыі заказніка жывуць 154 віды наземных пазваночных, зарэгістравана 15 відаў рыб, 9 амфібій, 5 - рэптылій. Мноства птушак - 119 відаў. Сярод іх найболын шырока распаўсюджаны пявучы дрозд, пеначка, лясны канёк, берасцянка. Паколькі тут хапае хваёвых лясоў, адзначаецца і даволі разнастай- ны комплекс тыпова тайговых відаў: глушэц, рабчык, дзяцел, крыжадзюбхваёвік, жоўтагаловы каралёк. Даволі высокая колькасць паляўніча-прамысловых відаў птушак: цецярук, рабчык, вальдшнэп.

З вадаплаўных птушак найболын звычайным Ві- дам, які гняздуецца тут, з'яўляецца крыжанка. Можна сустрэць і лысуху, чыркоў - свістунка і траскунка, чырванакніжнікаў - чорнаваллёвую гагару, арлана- белахвоста, змеяеда, скапу, пустальгу, пугача, шэрага жураўля, вялікага краншнэпа.

### Беларуская Амазонія

Такую назву балоты Гарадоцкага раёна атрымалі нездарма. Сваёй прыгажосцю, таямнічасцю і памерамі яны не саступаюць многім экзатычным мясцінам планеты. Каб бліжэй пазнаёміць натуралістаў і аматараў актыўнага адпачынку з унікальнай віцебскай прыродай, створана экалагічная сцежка «Таямніцы балот». Яна праходзіць уздоўж балота ў раёне возера Чысцік і цягнецца шэсць кіламетраў.

На сцежцы абсталявана 6 прыпынкаў, дзе можна атрымаць інфармацыю аб рэдкіх відах раслін і жывёл. На пачатку маршрута турыстаў сустракае маляўнічая брама са схемай вандроўкі. На цэнтральным стэндзе можна азнаёміцца з інфармацыяй аб заказніку і ахоўных тэрыторыях Гарадоцкага раёна, а таксама згадаць правілы паводзін на прыродзе.

Спачатку трэба ісці праз тыповы паўднёватайговы лес. У імшыстых ельніках заўсёды вільготна і ціха. Далей сцежка вядзе да мурашніка. На другім прыпынку размешчана інфармацыя аб раслінах балотных хвойнікаў і хвоі звычайнай. Побач са станцыяй знаходзіцца папуляцыя лінеі паўночнай. Напрыканцы чэрвеня можна палюбавацца яе прыгожымі ружовымі кветкамі-званочкамі з прыемным водарам ванілі і міндаля.

Наступная станцыя запрашае трохі

адпачыць і даведацца пра правілы арыентавання ў лесе. Наступныя прыпынкі прысвечаны жывёльнаму і раслiннаму свету ААПТ. 3 некаторымі прадстаўнікамі фаўны - зайцамі, вавёркамі, казулямі - можна сустрэцца пад-час экскурсіі, але гэта здараецца нячаста.

Нарэшце экалагічная сцежка выводзіць турыстаў да гаці з невялікай пляцоўкай для назіранняў. Гумавікі гулка тупаюць па драўляным насціле ў балоце. Крок у бок - і пад нагамі мякка пружыніць пухнаты розная- ляровы дыван са сфагнавых імхоў і балотных раслін. Дарэчы, балоты ў заказніку займаюць амаль 50 га. Калі сцішыцца і ўзброіцца оптыкай, можна йаназіраць за насельнікамі заказніка...

Адным словам, лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць! Тым болый, што дзівосныя лясныя краявіды побач!

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА**